Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-03-07

# На тым тыдні…

✓ **25 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася **прэзентацыя кнігі Алеся Пісьмянкова «Не знікай»**, прымеркаваная да дня нараджэння паэта.

«Не знікай», – так звычайна казаў на развітанне сябрам Алесь Пісьмянкоў, і гэтыя словы гучалі як спадзяванне на будучыя сустрэчы. Пранікнёныя і светлыя радкі паэта і сёння знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў, а жыццё яго, якое, на жаль, заўчасна абарвалася, працягваецца ў яго творах. Усе, каму пашчасціла сутыкнуцца з Алесем Уладзіміравічам, памятаюць яго светлым і шчырым, узнёслым і рамантычным чалавекам. Ён вымяраў сваё жыццё і свае творы шкалою каштоўнасцяў, напрацаваных нашымі продкамі, і заўсёды быў гатовы аддаць душэўную цеплыню людзям.

✓ **28 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа адкрылася **выстаўка «Старонкі гісторыі паўстання 1863–1864 гг.»**, дзе прадстаўлена больш за 100 друкаваных і рукапісных дакументаў XIX–XXI стст. з фондаў бібліятэкі: апісанні ваенных дзеянняў, зборнікі матэрыялаў справаводства і публіцыстыкі, мемуары, даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў. Бібліятэкаю падрыхтаваны відэафільм «Паўстанне 1863 года».

Наведнікі выстаўкі змаглі ўявіць атмасферу працы над тэмай паўстання 1863–1864 гадоў. Імпрэза арганізаваная бібліятэкай сумесна з Польскім Інстытутам у Мінску.

✓ **28 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках міжнароднага праекта «А. Пушкін і А. Міцкевіч. Скрозь далечыню стагоддзяў…» (прысвечанага 215-годдзю з дня нараджэння паэтаў) адбыліся **майстар-класы па музейнай педагогіцы «У Вас у гасцях Пушкінскі запаведнік»**, якія праводзіліся для беларускіх калег-музейшчыкаў і педагогаў навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае».

✓ **1 сакавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі выстаўку **«Салон-атэлье пачатку XX стагоддзя»**, прымеркаваную да Міжнароднага жаночага дня. Музей запрасіў наведнікаў зазірнуць у такі салон, дзе дэманструюцца сукенкі, элементы адзення, дамскія аксесуары «цудоўнай эпохі», а прадметы інтэр'еру (прасы, швейныя машынкі і інш.) дазволілі акунуцца ў інтэр'ер майстэрні мадысткі таго часу.

Выстаўка працуе да 11 сакавіка.

✓ **1 сакавіка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прайшла **творчая сустрэча з Уладзімірам Цэслерам** з нагоды яго выставачнага праекта «Практыка рынкавага рэалізму». Аўтар разважаў над прадстаўленымі на выстаўцы жывапісам, скульптурай, арт-аб'ектамі і іншымі праявамі яго крэатыўнасці і схільнасці да парадоксаў.

✓ **1 сакавіка** супрацоўнікі і наведнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры першы вясновы дзень сустрэлі разам з выдатным творчым дуэтам «Аляксандра і Канстанцін», які прэзентаваў **чацвёрты паўнафарматны дыск «М1»**, назву якому дала інструментальная кампазіцыя Road M1 (Траса М1).

Дыск уключае 14 трэкаў – песні на беларускай, рускай і англійскай мовах, а таксама інструментальныя кампазіцыі.